

Чым уразіў Форум рэгіёнаў

МС



Лечым сэрца СТАР. 13



Садовы каляндар на ліпень СТАР. 16

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
№126 (28490)
5 ЛІПЕНЯ 2017 г. СЕРАДА
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ — ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ стар. 5–12

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей НАЛІВАЙКА, міністр па падатках і зборах:**

*«У сусветнай практыцы падаткам на багацце, раскошу абкладаюцца, як правіла, аб'екты нерухомасці. У нашай рэспубліцы ў дачыненні да такіх аб'ектаў выплачваюцца падатак на нерухомасць і зямельны падатак. Таму пытанне аб увядзенні падатку на багацце намі не разглядалася. Іншае пытанне — гэта вызначэнне справядлівага кошту, з якога робіцца вылічэнне падаткаў на маёмасць. Як паказвае міжнародны вопыт, падаткаабкладанне нерухомасці на аснове кадастравага кошту з'яўляецца найбольш прагрэсіўным і эфектыўным. Таму далейшае рэфармаванне сістэмы падаткаабкладання павінна прадугледжваць змяненне падыходаў да падаткаабкладання нерухомай маёмасці ў залежнасці ад каштоўнасці аб'екта нерухомасці».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 5.07.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9442 | ▲ |
| Еўра | 2,2071 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0328 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0746 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Святкуем!

# Каб радасна было ўсім



Фота БЕЛТА.



**Бабруйск у гэтыя дні адзначае 630-годдзе. Адным з мерапрыемстваў, прысвечаных памятнай гістарычнай падзеі, стала адкрыццё Маладзёжнага парку, размешчанага паміж Палацам мастацтваў і ГЦ «Карона». Гэта месца калісьці планавалі аддаць пад аквапарк, але пару гадоў таму па ініцыятыве Маладзёжнага парламента горада на пустыцы вырашылі стварыць парк.**

**Гараджане чакалі гэтай падзеі: у вялікім мікраараёне да гэтага не было ўтульнага сквера. У парку ўзвышаюцца круглая альтанка-ратонда, каланада, дзве аркі, ёсць фантан, лаўкі і веладарожкі. Сёння па парку гуляюць маладыя мамы з дзецьмі, ёсць месца для моладзі і бабруйчан старэйшага ўзросту. Зеленяюць маладыя дрэўцы — іх тут звыш 240, уздоўж дарожак кусты — іх у парку тры з лішнім тысячы.**

■ Працяг тэмы

# ТАКІХ МУЗЕЯЎ НАМ НЕ ХАПАЕ

**У Магілёўскай вобласці на прыкладзе літаратурнага музея Максіма Гарэцкага ў Мсціслаўскім раёне абмеркавалі шляхі папулярызацыі падобных устаноў**



**Гэта адбылося ў рамках XXV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Гарэцкія чытанні». Беларускі пісьменнік, літаратуразнаўца, перакладчык, фалькларыст Максім Гарэцкі нарадзіўся ў 1893 годзе ў вёсцы Малая Багацькаўка на Мсціслаўшчыне. Яго ўклад у беларускую літаратуру неацэнны. «На імперыялістычнай вайне», «Дзве душы», «Камароўская хроніка» і іншыя яго творы ўвайшлі ў залаты фонд нашай літаратурнай спадчыны. А яшчэ ім створаны не менш значныя і цікавыя літаратурна-крытычныя і навуковыя працы. Ягоная «Гісторыя беларускай літаратуры» на працягу першага паслярэвалюцыйнага дзесяцігоддзя служыла адзіным падручнікам для сярэдняй і вышэйшай школы. Максімам Гарэцкім былі таксама падрыхтаваны і выдадзены «Хрэстаматыя беларускай літаратуры: XI стагоддзе — 1905 год», «Руска-беларускі слоўнік» і шмат чаго іншага. Нам застаецца толькі ганарыцца такім земляком і папулярызаваць яго творчасць. А з гэтым, на жаль, ёсць праблемы.**

СТАР. 4




# «ДЗЕ ХАЧУ, ТАМ І ПЛАВАЮ»

**Канец мінулага працоўнага тыдня выдаўся ў Мінску спякотным. Ртутны слупок упэўнена перасягнуў адзнаку ў 30 градусаў па Цэльсіі. А значыць, да воднай прахалоды ў такое надвор'е пацягнуцца сотні адпачывальнікаў. Ці ўсе яны зважаюць на правілы бяспечных паводзін? За гэтым назіралі карэспандэнты «Звязды», якія выправіліся на Камсамольскае возера.**

— Калі на вуліцы надвор'е спякотнае, то парушальнікі з'яўляюцца з самай раніцы, — кажа **начальнік выратавальнай станцыі «Камсамольскае возера» Дзяніс ЧАШУН.** — Сапраўдная «тэрмаядзерная» сумесь — цёплае надвор'е на выхадных. У будні ж зранку крыху цішэй: большасць жа людзей працуе па графіку 5/2.

Тры гады таму Таварыства ратавання на водах пачало патруляваць акваторыю возера з міліцыянерамі. Далёка не ўсе адпачывальнікі ўсведамляюць, што, купаючыся ў недазволеных месцах, яны рызыкуюць сваім жыццём. Пачынаеш ушчуваць — у адказ чуеш нецэнзурную лаянку. А летась два тыдні аб'езды акваторыі ажыццяўляліся з АМАПам. Настаў пік, калі людзі, якія купаліся ў забароненых месцах, зрабіліся нахабнымі проста да такой ступені, што не слухалі нікога. Вось і давялося ўжыць такі моцнадзеючы сродак. Тады ўсіх парушальнікаў дастаўлялі на выратавальную станцыю, дзе адным выдаваліся папярэджанні, а «рэцыдывістам» міліцыянеры выпісвалі штрафы па артыкуле 23.63 КоАП. Санкцыя прадугледжвае грашовае пакаранне да трох базавых велічынь.

СТАР. 4



Фота Надзеі БУЖАН.